Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
22 САКАВІКА 2017 г. СЕРАДА № 54 (28418)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як атрымаць участак у вёсцы?** МС



**Вырошчваем перапёлак дома** МС




**Усе хваробы ад нерваў**

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Мы прапанавалі спрасціць працэдуру па будаўніцтве фізічнымі асобамі індывідуальнага жылля. Так, мяркуецца, што ў наяўным жыллёвым фондзе прымаць рашэнне па ўсіх пытаннях будзе галоўны архітэктар раёна: і па размяшчэнні аб'ектаў, і па пытаннях пажарнай і санітарнай бяспекі, і іншых. Новае жыллёвае будаўніцтва будзе ажыццяўляцца па горадабудаўнічых пашпартах. Чалавек не павінен ведаць усе патрабаванні Жыллёвага кодэкса, будаўнічых стандартаў. Ён атрымае горадабудаўнічы пашпарт, у якім будуць дакладна прапісаныя ўсе яго правы і абавязкі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8797 | ▼ |
| Еўра | 2,0266 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0699 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# «ЗДАРОВЫЯ» ТЭХНАЛОГІІ

**Найбуйнейшы ў краіне медыцынскі форум BelarusMedica стартаваў у сталіцы**




Фота БЕЛТА.

**Ён уключае ў сябе міжнародныя спецыялізаваныя выстаўкі «Ахова здароўя Беларусі—2017», «ФармЭкспа» і «Стаматалогія Беларусі». Арганізатарам выступае Міністэрства аховы здароўя і выставачная кампанія «Тэхніка і камунікацыі» (T&C).**

СТАР. 3

■ Найлепшае — сваё

## ПАКАШТУЕМ БАНКУХУ?

Цяпер гэта проста: можна прыгатаваць самому, а можна адправіцца па гастранамічным маршруце

**Дзе пакаштаваць блінцы з гарбузоў, груздоў, з ляснымі арэхамі, журавінамі, тукам ці зробленыя на казіным малацэ? Хто парадуе дамашнімі сырамі і каўбасамі, а мо і падкажа, як квасіць капусту ў вілках і пячы хлеб? Як гатуюцца пячыста, скрылькі, каўкі, журэк? Дзе падаюць смажаныя з грыбамі мазгі, мядовае мяса, каркуўку з паляндвіцы ў бульбяным жупане, фаршыраваных карпаў і шчупакоў, ліня запечанага з морквай і лімонам, далікатэсы са шчупаковай ікры, аляніну пад журавінным соусам? Не здзіўляйцеся, але ўсімі гэтымі і многімі іншымі стравамі могуць пачаставаць у нашых вёсках. Гаспадары беларускіх аграсядзіб гатовы кінуць выклік шэф-кухарам, якія працуюць над рэцэптамі розных кухняў свету.**

СТАР. 4



■ Сацыяльны праект

## «БАБУЛЯ НА ГАДЗІНУ» ГАТОВАЯ ДАПАМАГЧЫ

**У Мінску нядаўна з'явіліся «бабулі на гадзіну». Жанчыны на пенсіі адпраўляюцца ў шматдзетныя сем'і і сем'і з дзецьмі-інвалідамі, каб на некалькі гадзін ператварыцца ў няню. І ўсё гэта цалкам бясплатна.**

Ніна Ягораўна Пракопава ўжо трэці месяц прыходзіць у сям'ю мінчан Алены і Віталя Кірыенкаў, каб пасядзець з чатырохгадовым Стасікам.

— Гэта вельмі самастойны хлопчык, — усміхаецца яна. — Калі я прыйшла першы раз, мы з ім дзесяць хвілін пагаварылі, а потым ён сказаў: «Табе пара ісці...». Але потым хутка прывык да мяне. Мы тут з ім гуляем, малюем, вучым лічбы, расказваем адно аднаму гісторыі.

Для мамы Стасіка прыход Ніны Ягораўны — сапраўднае выратаванне. «Бабуля ў нас — асноўная група падтрымкі», — кажа маладая жанчына. Яе старэйшаму сыну Мікіту 10 гадоў, Стасік — сярэдняе дзіця, а пяць месяцаў таму нарадзілася дачка Ксенюшка. «Пакуль я займаюся са старэйшым дамашнімі заданнямі, тата сядзіць з малодшанькай, а Ніна Ягораўна гуляе з сярэднім дзіцем», — гаворыць яна.

«Вольны час у мяне ёсць, дык чаму б не дапамагчы людзям? Тым больш што яны маюць патрэбу ў такой дапамозе», — кажа Ніна Ягораўна. У наступным годзе ёй спаўняецца 70. «Немаладая ўжо», — спакойна канстатуе гэтая падцягнутая жанчына ў джынсах. Але ж і не старая! Цяпер Сусветная арганізацыя аховы здароўя па-іншаму глядзіць на гэты ўзрост... «Так, калі лічыць, што людзі павінны жыць да 120 гадоў, то я — у сярэдзіне жыцця», — усміхнуўшыся, згаджаецца мая суразмоўніца.

Яна ўсё жыццё працавала інжынерам-тэхнолагам. Цяпер дзеці ўжо дарослыя. Унукі таксама выраслі, старэйшаму 29 гадоў. «Апошнія гады я даглядала сваю маму. Гэтым летам яна памерла, ёй было 96 гадоў, — кажа Ніна Ягораўна. — А я восенню паступіла ва Універсітэт трэцяга ўзросту, вырашыла навучацца ландшафтнаму дызайну. У мяне ёсць дача, буду ёю цяпер займацца. Вучыцца вельмі цікава! Да таго ж у нас ва Універсітэце многія займаюцца валанцёрствам.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДОБРАМУ ІНВЕСТАРУ — НАЛЕЖНЫЯ ЎМОВЫ

## Прэзідэнт здзейсніў рабочую паездку ў Магілёўскую вобласць

**Верталёт кіраўніка дзяржавы прызямліўся на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Магілёў», дзе працуе шэраг цікавых і, галоўнае, прыбытковых прадпрыемстваў з замежным капіталам. Мэта паездкі, як прызнаўся Прэзідэнт падчас размовы з працоўным калектывам кампаніі «Кранаспан ОСБ», — паглядзець, як працуюць у нас замежнікі і ці трэба надалей прыцягваць такія інвестыцыі.**

Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады Уладзіміра Даманеўскага, старшыні Магілёўскага аблвыканкама, і Андрэя Ярцава, кіраўніка адміністрацыі СЭЗ «Магілёў». Эканамічныя паказчыкі па рэгіёне сведчаць пра пазітыўныя тэндэнцыі. Аднак, падкрэсліў Прэзідэнт, зніжаць планку нельга ні ў якім разе.

З тым, як асвойваюцца замежныя інвестыі, кіраўнік дзяржавы азнаёміўся на прыкладзе замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кранаспан ОСБ», якое спецыялізуецца на выпуску арыентавана-стружкавых пліт. Увогуле ж кампанія «Кранаспан» (галоўны офіс яе базіруецца ў Аўстрыі) мае 120-гадовую гісторыю і сёння ўключае ў сябе больш за 40 вытворчых і гандлёвых аб'ектаў у 29 краінах свету. Фірма з'яўляецца сусветным лідарам па вытворчасці ДСП, ДВП, арыентавана-стружкавых пліт, падлогавых пакрыццяў, смолаў для вытворчасці драўнінных пліт. «Кранаспан» пастаўляе сваю прадукцыю ў больш чым 125 краін свету.

Беларускі лідар застаўся задаволены тым, што ён убачыў: «Хацелася б, каб у нас было болей такіх прадпрыемстваў. Няхай мяне пачуюць тыя крытыкі, якія наваліліся на мяне дзесяць гадоў таму, калі мной было прынята рашэнне па мадэрнізацыі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Вы можаце параўнаць сваю вытворчасць — самую сучасную — з тымі вытворчасцямі...»

Прадпрыемства «Кранаспан ОСБ» — добры прыклад таго, як асвойваюцца замежныя грошы. Улады ішлі насустрач інвестарам і гатовы рабіць гэта і надалей. «Калі ласка, у нас велізарныя плошчы, якія мы яшчэ не можам асвоіць. Бяры ў арэнду плошчы, спачатку патрону — пакажыце, як вы там будзеце працаваць. Лес — гэта не пустыня. Гэта дарогі, гэта аднаўленне лесу... Яны ўзялі на сябе абавязкі. Калі яны ў Беларусі будуць так працаваць, шчыра запрашаем. Мы будзем перадаваць ім у арэнду пэўныя лясныя ўгоддзі, каб яны маглі гэты лес там здабываць, а потым наводзіць парадак і садзіць лес нанова. Каб праз 80—100 гадоў нашы дзеці, унукі, праўнукі маглі жыць і перапрацоўваць гэты лес», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адна ўмова, якую Прэзідэнт паставіў перад замежнікамі, у прыватнасці перад кіраўніцтвам «Кранаспана»: тэхніка, якая будзе працаваць у лесе, на перавозцы, лесанарыхтоўцы, — павінна быць беларуская, у нас усё гэта выпрацавана. Яны пагадзіліся.

***

Падчас размовы з працоўным калектывам прадпрыемства Прэзідэнт закрануў самыя актуальныя на сённяшні дзень для грамадства тэмы

### Аб зарплатах і занятасці

Прэзідэнт расказаў, што забараніў праводзіць скарачэнні на прадпрыемствах і ў арганізацыях і звальняць работнікаў без узгаднення з мясцовымі органамі ўлады. Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, што гэта звязана з неабходнасцю працаўладкавання вызваленых работнікаў у іншым месцы. «Нельга ў цяжкі час выкідваць людзей на вуліцу. Гэта няправільна. Няхай гэта не рынкава, але пакуль мы будзем дзейнічаць гэткім чынам», — падкрэсліў беларускі лідар. «Сёння, калі я патрабую сярэднюю зарплату ў тысячу рублёў, ужо некаторыя падумваюць: так, дадзім тысячу, але скароцім энную колькасць людзей. Вось гэта без узгаднення з мясцовымі органамі ўлады рабіць нельга. Чаму? Калі ты намеціў скарачэнне, узгадні з органамі ўлады, куды гэтыя людзі пойдуць».

Выказаўся кіраўнік дзяржавы і накont дэкрэта №3. Ён падкрэсліў: нарматыўны акт не адменены. «Дэкрэт №3 я не адмяняў. І нават не прыпыніў. Дэкрэт сёння працуе». «Мы павінны навесці ў краіне парадак. Настаў час, калі трэба наводзіць парадак і з занятасцю людзей. Што дрэннага? Я хачу, каб усе людзі працавалі, хачу за два-тры гады ўсіх працаўладкаваць», — адзначыў Прэзідэнт.

### Сітуацыя ў краіне — кантраляваная

Супрацоўнікі прадпрыемства, якія прыйшлі на сустрэчу з кіраўніком краіны, задалі яму свае пытанні. Дзмітрый Сельмахоў, інжынер-энергетык, закрануў нядаўняе здарэнне: калі з мэтай увозу выбуховых рэчываў, наркотыкаў, зброі адбылася спроба незаконнага перасячэння мяжы.

Прэзідэнт прызнаўся, што не памятае такой ночы, за якую адбылося б пяць буйных здарэнняў на мяжы, па якіх кіраўніку дзяржавы дакладвае непасрэдна камандуючы пагранічнымі войскамі. «Вы павінны зразумець, што ў свеце такіх людзей не сотні тысяч, але тысячы ёсць — спецыялістаў, якія здзяйсняюць правакацыі. Яны, безумоўна, кіраваныя — спецслужбамі пэўных дзяржаў. Яны ўсе на кантролі», — запэўніў кіраўнік дзяржавы. «Такія людзі ёсць, якім трэба ўзарваць абстаноўку ў краіне, я іх называю пятай калонай, ніякая гэта не апазіцыя», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Паверце, што сітуацыя ў краіне кантраляваная», — запэўніў Прэзідэнт, дадаўшы, што дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне ўлада не дапусціць. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што замежныя інвестары нікалі б не прыйшлі ў Беларусь, калі б тут было неспакойна, калі б тут былі крадзяжы і карупцыя. «Значыць, нам давяраюць. Таму не хвалюйцеся, краіну мы нікому не аддадзім. Мы яе будзем трымаць разам з вамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### Наш галоўны патэнцыял

Ірына Давыдзенка, супрацоўніца адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны «Магілёў», спытала ў Прэзідэнта, што яшчэ можна зрабіць для фарміравання больш спрыяльных умоў для інвестараў і для развіцця бізнесу ў цэлым.

Кіраўнік дзяржавы адказаў: калі сцісла, то спрыяльныя ўмовы — гэта як мага менш падаткаў і як мага больш бясплатнай сыравіны. Падатковых ільгот для інвестараў у нас таксама дастаткова, напрыклад, на той жа ўвоз абсталявання. «Увогуле, калі прадпрыемства працуе сумленна, — я ім паабяцаў — падтрымаем яшчэ па нейкіх кірунках», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт падкрэсліў — самая вялікая праблема ў свеце — навучанне людзей. У Беларусі ж няма чалавека, які б не скончыў школу. Вось і атрымліваецца, што людзі — наш галоўны рэсурс — інтэлектуальны.

Уласнік групы кампаній «Кранаспан» Пітэр Кайндл заявіў, што для развіцця яго прадпрыемстваў у Беларусі створаны самыя спрыяльныя ўмовы. Бізнесмен асобна падзякаваў за гэта Прэзідэнту, яго Адміністрацыі, беларускаму ўраду і кіраўніцтву Магілёўскага аблвыканкама. Ён паведаміў, што кампанія «Кранаспан» вырашыла значна павялічыць аб'ём сваіх інвестыцый. Першапачатковa па інвестыцыйным дагаворы кампанія абавязвалася ўкласці ў вытворчасці 150 млн долараў і стварыць 150 працоўных месцаў. Але ўжо ў 2017 годзе аб'ём інвестыцый павінен перавысіць $1 млрд, а за 2010—2016 гады было створана больш за тысячу працоўных месцаў. Кампанія бізнесмена таксама прапануе беларускаму ўраду стварыць у Шклове завод па вытворчасці дэкаратыўнай паперы.

Адказваючы на пытанне Аксаны Мельнік, якая працуе ў аддзеле продажаў кампаніі «Кранаспан», пра тое, чаго ён чакае ад Года навукі, Прэзідэнт адзначыў: трэба, каб навука ішла ў вытворчасць.

— Я б вельмі хацеў, каб наша навука здзейсніла прарыў у лячэнні людзей і, самае галоўнае, каб мы нарэшце перамаглі гэтую страшную чуму, страшную хваробу, з якой мы не можам справіцца. Калі б тут быў прарыў і мы б навучыліся лячыць ракавыя пухліны, як звычайную хваробу, гэта было б шчасце, — прызнаўся Прэзідэнт.

Асобная ж мара кіраўніка дзяржавы — каб беларускія навукоўцы вынайшлі новую крыніцу энергіі.

***

Пасля сустрэчы з кіраўніцтвам і работнікамі кампаніі «Кранаспан ОСБ» Прэзідэнт накіраваўся ў гарадскі пасёлак Копысь. Там ён асабіста пракантраляваў ход сельскагаспадарчага эксперыменту, пра які гаварылася на нарадзе восенню мінулага года. Тады, нагадаем, гаворка ішла аб аб'яднанні некалькіх аграгарадкоў у эксперыментальны высокатэхналагічны холдынг з поўным цыклам вытворчасці.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,** *yushkevich@zviazda.by*

*г. Магілёў.*

■ Блізкая ўлада

# ЗВАНКОЎ СТАНОВІЦЦА МЕНШ

## Старшыня Мінгарвыканкама асабіста адказаў на пытанні мінчан



**За два гады вопыт правядзення прамых тэлефонных ліній даказаў сваю слушнасць. Жыхары Беларусі дакладна засвоілі, што ёсць просты спосаб абмеркаваць пытанні, якія іх хвалююць з прадстаўнікамі розных галін улады. У мінулую суботу ў мінчан была магчымасць асабіста звярнуцца як да кіраўнікоў раёнаў, так і да мэра. У прамой лініі старшыні Мінгарвыканкама Андрэя ШОРЦА ўзяў удзел і карэспандэнт «Звязды».**

Да мэра датэлефанаваўся мужчына, які застаўся незадаволены якасцю рамонту пры здачы дома. Як варыянт вырашэння праблемы, яму прапанавалі перарабіць няякасную апрацоўку, аднак ён выказаў жаданне атрымаць матэрыяльную кампенсацыю. Тым не менш, маючы на ўвазе складанасці разлікаў яе памеру, ажыццявіць гэта не ўяўляецца магчымым. Мужчына абяцаў прыняць рашэнне аб тым, ці згодны ён на рамонтные работы, у найбліжэйшы час.

Жыхарка дома па вуліцы Касманаўтаў, 32 паскардзілася на тое, што каля жылой пабудовы ўсталёўваюць рэкламны шчыт, які практычна цалкам закрывае агляд з вокнаў жыхарам некаторых кватэр аж да трэцяга паверха. Андрэй Шорац даў указанне праверыць адпаведнасць канструкцыі тэхнічным нормам. У выпадку іх парушэння ўстаноўка будзе спынена.

Сырасцю ў памяшканні аказалася незадаволеная жыхарка дома ад Мінскай агароднінай фабрыкі, якая спрабуе разабрацца з сітуацыяй ужо некалькі гадоў. Хоць не так даўно ў доме быў адрамантаваны дах, праблема засталася. А вось у новым доме на Лагойскім тракце цяжкасці якраз супрацьлеглыя: з-за тэхнічнай памылкі яго здалі без водазабеспячэння. Пытанне да камунальнікаў паўстала і ў жыхароў кватэры, набытай у растэрміноўку, якім плацяжы налічваюць «па незразумелых тарыфах».

Добра падрыхтаваным зарэкамендаваў сябе жыхар дома па адрасе Жудро, 7: ён на памяць цытаваў урыўкі з указаў і законаў, усё таму, што вядзе ўжо шматмесячную барацьбу з неправаменым капітальным рамонтам. А вось мінчанка, якая пражывае па адрасе Народная, 30, у кватэру заехала зусім нядаўна, 13 лютага, аднак у жыллі не аказалася газавай пліты. Да гэтага моманту яна так і не была ўсталяваная, тым не менш плацеж за газ ёй ужо паспеў прыйсці.

Максімальна далёкім ад сферы ЖКГ аказалася пытанне маці-адзіночкі, якая выхоўвае дзіця-інваліда, аб яе правах. Усім заяўнікам кіраўнік Мінгарвыканкама паабяцаў разабрацца ў іх праблеме ці даць афіцыйны адказ, чаму гэта немагчыма. Па рашэнні некаторых пытанняў ён даў распараджэнні ўжо падчас правядзення прамой лініі.

Андрэй Шорац адзначыў, што ў параўнанні з першымі прамымі лініямі актыўнасць грамадзян значна знізілася. Гэта сведчыць аб тым, што праблемы знаходзяць вырашэнне на мясцовым узроўні ў тых, хто павінен з імі спраўляцца ў сілу прафесійных абавязкаў. Мэр Мінска выказаў надзею, што калі-небудзь на прамую лінію ў Мінгарвыканкам не паступіць ніводнага праблемнага званка, а хто-небудзь нават падзякуе за працу чыноўнікаў.

У гэты ж раз было прынята 70 званкоў, з 19 заяўнікамі паспеў асабіста паразмаўляць Андрэй Шорац.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

# НЕ ТОЛЬКІ СКАРГІ, АЛЕ І ПАДЗЯКІ



**30 званкоў з розных раёнаў вобласці паступіла на прамую лінію старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра ДВОРНІКА. Практычна кожны трэці зварот, які паступаў падчас папярэдніх прамых тэлефонных ліній, быў вырашаны станоўча. Астатнія былі або растлумачаны, або паставлены на кантроль. Між тым гэтым разам частка праблем людзей была знята загадзя — адразу ж пасля таго, як людзі запісваліся на прыём да губернатара.**

— Запіс на прыём пачынаецца за месяц, — адзначыў Уладзімір Дворнік. — Мы паведамляем гэта на месцы, фактычна даём старшыням райвыканкамаў час, каб закрыць пытанне. Цяпер у райцэнтрах да мяне падыходзяць людзі і дзякуюць за дапамогу, пры гэтым са здзіўленнем адзначаюць, што праблема рашылася літаральна праз дзень, як яны запісаліся да мяне на прыём. Калі ёсць хоць бы адзін законны варыянт зрабіць тое, што просяць людзі, трэба зрабіць гэта для іх.

Гэтым разам самымі распаўсюджанымі сталі пытанні працаўладкавання і водазабеспячэння. Жанчына з Калінкавіцкага раёна папрасіла дапамагчы ўладкавацца на працу вартаўніком у дзіцячы садок. Па яе словах, на гэту пасаду ўзялі пенсіянера, а ёй адмовілі, спаслаўшыся на яе хранічнае захворванне сэрца. З аграгарадка Краснае Гомельскага раёна папрасілі аднавіць дарогу да школы, якую заараў напярэдадні. Таксама паступіла калектыўная просьба пра працаўладкаванне людзей з парушэннем слыху. Па ўсіх зваротах Уладзімір Дворнік даў даручэнні спецыялістам падрабязна разабрацца ў сітуацыях.

Падчас прамой лініі паступалі званкі ад жыхароў Гомельскай вобласці ў тым ліку і з падзякай за дапамогу. У прыватнасці, жанчына з Мазыра расказала пра тое, што пасля ўмяшання кіраўніка рэгіёна было прынята рашэнне не будаваць шматпавярховы дом там, дзе жыхары суседніх дамоў хацелі закласці сквер і зрабіць месца адпачынку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Экстранны саміт ЕС па тэме брэксіту пройдзе 29 красавіка



Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Бруселі старшыня Савета ЕС Дональд Туск. Раней прадстаўнік прэм'ер-міністра Злучанага Каралеўства Тэрэзы Мэй заявіў, што Вялікабрытанія афіцыйна пачне працэдуру выхаду краіны з Еўрасаюза 29 сакавіка. Па словах Туска, мэта Бруселя на перагаворах з Лонданам — зрабіць працэдуру выхаду краіны з ЕС як мага менш балючай.

### На тэледэбатах у Францыі найбольш папулярным аказаўся Эманюэль Макрон

Гледачы першых тэлевізійных дэбатаў кандыдатаў на пасаду прэзідэнта Францыі прызналі колішняга міністра эканомікі краіны Эманюэля Макрона найбольш пераканаўчым сярод пяці ўдзельнікаў дыскусіі. Пра гэта сведчаць даныя сацыялагічнага інстытута Elabe. 29% апытаных аддалі перавагу Макрону, 20% — лідару «Непадпарадкаванай Францыі» Жан-Люку Меланшону. Па 19% у кіраўніка Нацыянальнага фронту Марын Ле Пен і кандыдата ад рэспубліканцаў Франсуа Фіёна. Кандыдат ад сацыялістаў Бенуа Амон заручыўся падтрымкай толькі 11% тэлегледачоў. Усяго ў апытанні прынялі ўдзел 1,1 тыс. чалавек.

### Рэкі Ганг і Ямуна абвясцілі юрыдычнымі асобамі



Рашэнне было прынята суддзямі індыйскага штата Утаракханд, якія разглядалі зварот мясцовага жыхара. Той звярнуўся ў суд з нагоды захопу прыбярэжных земляў каля аднаго з прытокаў ракі Ганг. Каб захаваць Ганг і Ямуна, яны і ўсе іх прытокі і рэчышча абвешчаны юрыдычнымі асобамі з усімі адпаведнымі правамі і абавязкамі, гаворыцца ў рашэнні суда. Неабходнасць такой меры тлумачыцца тым, што Ганг і Ямуна «губляюць само сваё існаванне», з'яўляючыся пры гэтым важнай часткай індыйскага грамадства.

## Адказаць, вырашыць, дапамагчы

Набіраць па суботах нумар тэлефона гарадской, раённай ці абласной адміністрацыі — ужо традыцыя. Прамыя лініі дапамагаюць хутка, а галоўнае — эфектыўна рэагаваць на праблемы. 25 сакавіка чыноўнікі ў розных кутках Беларусі зноў выйдуць на сувязь з народам. Колькасць зваротаў становіцца ўсё меншай, ды і праблемы грамадзян імкнуцца вырашаць, што называецца, па гарачых слядах.

**25 сакавіка з 9.00 да 12.00 на тэлефонныя званкі адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам:** першы намеснік старшыні Токар Мікалай Васілевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:** старшыня Шарстнёў Мікалай Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Прывалаў Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Бубенчык Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам:** старшыня Даманеўскі Уладзімір Віктаравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам:** намеснік старшыні Сірэнка Віктар Іванавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам:** старшыня Савета дэпутатаў Панасюк Васіль Уладзіміравіч (80172224444).

# ЗОНА АДКАЗНАСЦІ

### Пагранічнікі ўзмацнілі меры бяспекі на ўчастку беларуска-ўкраінскай мяжы

**Як паведамляла ўчора «Звязда», 20 сакавіка ў 1.45 ночы аўтамабіль маркі «Джып» у пункце пропуску «Аляксандраўка», збіўшы шлагбаум, праехаў праз сродак прымусовага спынення і, атрымаўшы механічныя пашкоджанні, паспрабаваў прарвацца ўглыб тэрыторыі Беларусі. Для затрымання аўтамабіля супрацоўнікі органаў памежнай службы ў пункце пропуску ўжылі табельную зброю.**

Па факце спробы прарыву праз дзяржаўную мяжу Следчы камітэт пачаў крымінальную справу. Падчас вонкавага агляду аўтамабіля ў ім быў знойдзены пісталет маркі ТТ і два магазіны з патронамі, а таксама прадмет, знешне падобны на траціл, і электрадэтанатары.

Пагранічнікі ў сувязі з інцыдэнтам узмацнілі меры бяспекі на ўчастку беларуска-ўкраінскай мяжы, паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ.**

Затрыманы два чалавекі. Па наяўнай інфармацыі, у аўтамабілі мог знаходзіцца яшчэ адзін невядомы, які цяпер адшукваецца. «У зоне адказнасці Мазырскага пагранічнага атрада праводзяцца аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы. У сувязі з гэтым узмоцнены меры бяспекі як у самых пунктах пропуску, так і на тэрыторыі памежнай зоны. Супрацоўнікамі органаў пагранічнай службы праводзяцца мерапрыемствы па кантролі ўезду, уваходу і знаходжання ў памежнай зоне асоб і транспартных сродкаў», — расказаў Антон Бычкоўскі.

«Транспартныя сродкі аглядаюцца, узмоцнены меры па праверках дакументаў», — дадаў ён. Дадатковыя праверкі і кантрольныя мерапрыемствы магчымыя пры перасячэнні асноўных напрамкаў дзяржаўнай мяжы. На гэты час вышук трэцяга парушальніка працягваецца. Адпрацоўваюцца ўсе магчымыя маршруты яго руху. Беларускія і ўкраінскія памежнікі працуюць ва ўзаемадзеянні.

## Боепрыпасы правезці не ўдалося

**Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкай мытні, спынена спроба перамясціць праз мяжу боепрыпасы да агнястрэльнай зброі.**

58-гадовы брастаўчанін разам са сваякамі вяртаўся на легкавым аўтамабілі дадому з Украіны праз пункт мытнага афармлення «Олтуш». Пры наглядзе машыны службовыя асобы заўважылі каробкі з боепрыпасамі, а дакладней 55 патронаў. Спецыялісты абласнога ўпраўлення дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз далі заключэнне аб прыгоднасці гэтых патронаў для стральбы. Яны з'яўляюцца боепрыпасамі да пісталета Макарава, аўтаматычнага пісталета Сцечкіна, а таксама падыходзяць да іншых узораў ручной агнястрэльнай зброі.

Брастаўчанін затрыманы. Заведзена крымінальная справа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было Слова

# МІР ВЫПРАМЕНЬВАЕ КЛАСІКУ

### Па нядзелях у славутым замку будуць праходзіць канцэрты

**Асноўная тэматыка праграмы новага фэсту «LUX MIRUM» будзе прысвечана 500-годдзю айчыннага кнігадрукавання. Бо менавіта Мірскі замак — шэдэўр беларускай готыкі і рэнесансу — з'яўляецца равеснікам выхаду нашай друкаванай Бібліі.**

Кожную нядзелю (акрамя Вербнай і Вялікадня) у 13.00 у Мірскім замку можна будзе пачуць канцэрт класічнай музыкі, падрыхтаваны ансамблем «Вытокі», — для гэтага дастаткова набыць уваходны білет у замак. Акрамя канцэртаў, прысвечаных 500-годдзю асветніцкага подзвігу Скарыны, будуць і іншыя адметныя праграмы.

**Дырэктар музейнага комплексу «Мірскі замак» Аляксандр ЛОЙКА,** які нядаўна заняў гэту пасаду і цяпер з'яўляецца мастацкім кіраўніком фэсту, адзначыў:

— Па адукацыі я хормайстар. Доўгі час працаваў з харавымі калектывамі, паралельна з асноўнай работай. Пэўны час выкладаў дырыжыраванне, харавыя дысцыпліны. Таму цяпер імкнуся, каб у замка з'явіўся свой брэнд, музычны. Архітэктура — гэта застылая музыка. Вельмі хочацца, каб у сценах замка загучала музыка Сярэднявечча, а, магчыма, нават і сучасная.

Часткай праекта стануць канцэрты маладых музыкаў, якія займаюцца акадэмічнай творчасцю. Гэта серыя канцэртаў будзе называцца «Вытокі — юным талентам». Музыкі пазмагаюцца за галоўны прыз — «Залатую Грамату Мірскага замка» — яго ўручаць напрыканцы года. «Вельмі хацелася б, каб мы адкрывалі маладыя імёны, — дадаў Аляксандр Лойка. — Мы прадаставім пляцоўку маладым, таленавітым людзям, якіх пастараемся раскруціць дзякуючы нашаму музычнаму праекту».

— Сёлета спаўняецца 500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню, таму для правядзення канцэртаў нам хацелася знайсці месца з адпаведнай атмасферай і гісторыяй. Акурат такім аказаўся Мірскі замак, — расказаў **музычны кіраўнік фэсту, дырыжор і фагатыст Аляксей ФРАЛОЎ.** — Разам з дырэктарам намі быў прыдуманы фэст «LUX MIRUM», палацінску гэта азначае «Святло Міру». Мірскі замак заўсёды выпраменьваў культуру, бо гэта было адметнае месца заўжды, з часоў яго заснавання 500 гадоў таму.



Адна з урачыстых залаў Мірскага замка.

У наступную нядзелю ў замку адбудзецца канцэрт з удзелам першай віяланчэлі Вялікага Тэатра Беларусі — Аляксея Афанасьева. 2-га красавіка адбудзецца канцэрт «Замак Рэнесансу і Барока» з удзелам саліста Дзмітрыя Капілава і квартэта трамбаністаў Вялікага Тэатра. Адной з самым арыгінальных дзей стане канцэрт «Падмуркі...» у сутарэннях замка — архаічную і сярэднявечную музыку выканае спецыяльна запрошаны госць, прагучаць архаічныя інструменты, легенды і гісторыі пра іх.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# «ЗДАРОВЫЯ» ТЭХНАЛОГІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Штогод выстаўка збірае ў Мінску каля 200 вядучых вытворцаў і дыстрыб'ютараў абсталявання, паслуг, медыкаментаў, вырабаў медыцынскага прызначэння з Беларусі і іншых краін. Крайні-партнёрам сёлета выступіла Рэспубліка Індыя, якая прадставіла аб'яднаную экспазіцыю шэрагу індыйскіх кампаній.

Паводле слоў **міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Валерыя МАЛАШКІ,** сучасныя інавацыйныя рашэнні і тэхналогіі актыўна ўкараняюцца сёння ў паліклініках. «Неабходна больш інтэнсіўна развіваць тэхналогіі замяшчэння стацыянара, арганізоўваць папярэдняе абследаванне і далечванне пацыента ў амбулаторна-паліклінічных умовах, развіваць хірургію аднаго дня, адкрываць дзённыя стацыянары ў шпіталях. Менавіта ў паліклініках сёння павінны быць сканцэнтраваны спецыялісты, медыцынскае абсталяванне. Гэта задаволіць на працягу аднаго дня патрэбы пацыента ў дыягностыцы і правядзенні некаторых медыцынскіх умяшанняў, і на выстаўцы «Ахова здароўя Беларусі» можна ўбачыць такое высакаякаснае і сучаснае абсталяванне, якім мы аснасцім нашы паліклінікі і ўстановы аховы здароўя ў найбліжэйшы час», — адзначыў міністр.



Фота БЕЛТА.

На выставе «Ахова здароўя Беларусі-2017».

На адкрыцці мерапрыемства ён таксама не абышоў увагай нядаўні трагічны выпадак у Віцебску. Там 30-гадовая жанчына нарадзіла па месцы жыхарства дзяўчынку, якая ў выніку аспірацыі каляплоднымі водамі загінула. Міністр аховы здароўя зауважыў, што легалізаваць роды па даму ў нашай краіне пакуль рана. У першую чаргу неабходна рухацца па шляху аказання меддапамогі ва ўстановах аховы здароўя. Роды на даму без суправаджэння медработніка, без інфармавання сістэмы аховы здароўя, наогул самастойнае прыняцце такога рашэння бацькамі — злачынства ў дачыненні да дзіцяці. У іншых краінах, дзе падобная практыка ёсць, роды на даму прымаюць афіцыйныя акушэркі, якія маюць спецыяльныя сертыфікат, чаго і блізка не было ў дадзенай сітуацыі.

Валерый Малашка закрануў і тэму больш шырокага выкарыстання ў Беларусі медыцынскага страхавання. «Мы сёння кажам, што элементы страхавання павінны прыходзіць у сістэму аховы здароўя. Узаемадзеянне паміж Белдзяржстрахам і ўстановамі аховы здароўя адбываецца досыць паспяхова, што паказала летась сваю эканамічную эфектыўнасць».

Форум працуе па адрасе: пр-т Пераможцаў, 20/2, Футбольны манеж. Час работы: 22 і 23 сакавіка — з 10.00 да 18.00, 24 сакавіка — з 10.00 да 15.00.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## Знайсці работу дапаможа БРСМ

**Гарачыя лініі па аказанні дапамогі ў працаўладкаванні маладых людзей пачалі працаваць пры тэрытарыяльных камітэтах БРСМ.**

Моладзь сёння хоча працаваць, але не заўсёды ведае, куды звярнуцца і як знайсці работу. БРСМ пастараецца аказаць садзейнічанне ў працаўладкаванні маладых людзей, якія апынуліся ў складаней жыццёвай сітуацыі.

На гарачыя лініі можна звяртацца па тэлефонах: у Брэсце — 8 0162 2114 47; у Віцебску — 8 0212 42 68 87; у Гомелі — 8 0232 57 14 00; у Гродне — 8 0152 77 02 50; у Мінскай вобласці — 8 0172 89 15 28; у Магілёве — 8 0222 76 67 14; у Мінску — 8 0172 84 85 54.

Акрамя таго, Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў ЦК ГА «БРСМ» абвясціла аб запуску новага маштабнага рэспубліканскага даследавання «Моладзь на рынку працы». У перыяд з 22 сакавіка па 3 красавіка ва ўсіх рэгіёнах краіны пройдзе сацыялагічнае апытанне, мэтай якога з'яўляецца вывучэнне становішча моладзі Беларусі на рынку працы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЯК ВЫГЛЯДАЛІ НАШЫ ГАРАДЫ СТО ГАДОЎ ТАМУ?

**Фонды Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі папоўніліся вельмі каштоўнымі экзэмплярамі. Вядомыя беларускія гісторыкі, калекцыянеры, актыўныя ўдзельнікі праекта «У пошуках страчанага» Уладзімір Ліхадзедаў, Уладзімір Пефціеў і Уладзімір Багданаў перадалі ў дар музею дзве рэдкія нямецкія кнігі, карты і паштоўкі, выдадзеныя сто гадоў таму. У іх змешчаны сотні ўнікальных здымкаў гарадоў і мястэчкаў Заходняй Беларусі, што трапілі ў аб'ектывы кайзераўскіх фатографаў падчас Першай сусветнай вайны. Сярод іх — Брэст, Гродна, Баранавічы, якія зведалі на сабе цяжар ваеннага ліхалецця.**

— Такія экспанаты ў нашых музеях — вялікая рэдкасць, — гаворыць **дырэктар Музея ваеннай гісторыі Сяргей АЗАРОНАК.** — У кнігах падрабязна апісваюцца падзеі Баранавіцкай і Нарачанскай аперацый. Напрыклад, у кнізе пра Баранавіцкую аперацыю змешчана цікавая інфармацыя па тактыцы і стратэгіі нямецкіх і расійскіх войскаў, надрукаваны падрабязныя карты. На іх паказаны вёскі, вайсковыя ўмацаванні, нанесены ход вайсковых дзеянняў.

Кніга выдавалася ў Германіі двойчы: у 1917 і 1925 гадах. Нягледзячы на тое, што падчас Баранавіцкай аперацыі царскія войскі не здолелі прарваць абарону немцаў, кніга была перакладзена на рускую мову і выдадзена ў РСФСР у 1921 годзе як дапаможнік для будучых камандзіраў.

Акрамя таго, Музей ваеннай гісторыі, Музей Першай сусветнай вайны, што знаходзіцца ў вёсцы Заброддзе на Вілейшчыне, сумесна з Уладзімірам Ліхадзедавым, Уладзімірам Пефціевым і Уладзімірам Багданавым рыхтуюць у красавіку маштабную выстаўку, прысвечаную падзеям 1914—1918 гадоў на тэрыторыі Беларусі. Бо налета споўніцца сто гадоў з часу заканчэння той вайны.




— Пра падзеі тых часоў у нас помняць не так добра, — кажа **Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ.** — І мы спадзяёмся, што наша сумесная праца дапаможа ліквідаваць гэты прабел.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# МАГІЛЁЎ ІДЗЕ НА КАНТАКТ

M@RT КОНТАКТ 21-27 марта

## У горад завітаў XII Міжнародны маладзёжны тэатральны форум M.art.кантакт-2017

**Урачыстае адкрыццё з удзелам першага намесніка міністра культуры Ірыны Дрыгі, два кантакты — з казахскім тэатрам «Жас Сахна» і яраслаўскім імя Ф. Волкава і першыя водгукі на імправізаваны тэатральнай сцэне — гэта ўжо гісторыя. Але наперадзе яшчэ цэлы тыдзень тэатральнага жыцця.**

Лепшыя ўзоры класічнай і сучаснай драматургіі айчынных і замежных аўтараў, многія з якіх адзначаны высокімі тэатральнымі ўзнагародамі, пакажуць 20 тэатраў з 10 краін свету — Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Казахстана, Арменіі, Грузіі, Аўстрыі, ЗША. Большасць пастановак — гэта свайго роду эксперымент, новыя формы і жанры.

Летась адно з тэатральных дзействаў адбылося ў сценах этнаграфічнага музея, экспанаты якога сталі асноўнымі дэкарацыямі для спектакля. Сёлета гэты эксперымент паўторыць вільнюскі тэатр-студыя «Theaomai» з пастаноўкай «Браты Карамазавы». Яшчэ адных «Братоў Карамазавых» вязе ў Магілёў тэатр-студыя «Невялікі драматычны тэатр» Льва Эрэнбурга з Санкт-Пецярбурга.

— Мэта форуму — прапагандаваць тэатральнае мастацтва шляхам паказу лепшых твораў для моладзі, — падкрэсліў **дырэктар Магілёўскага абласнога тэатра Андрэй НОВІКАЎ.** — А яшчэ садзейнічаць павышэнню прафесійнага майстэрства ўдзельнікаў форуму, выяўленню і падтрымцы адораных акцёраў і рэжысёраў, развіццю міжнародных культурных сувязяў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ПАКАШТУЕМ БАНКУХУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На жаль, сёння гарадскія жыхары мала ведаюць пра нацыянальную кухню. А нашы прапрабабулі ўмелі чараваць з мясцовымі прадуктамі, і многія са старадаўніх рэцэптаў захаваліся да гэтых дзён.

Ужо не раз уздымаліся пытанні, што трэба зрабіць, каб завабіць у нашу краіну замежных турыстаў. Але якія мы ім ні прапаноўвалі б забавы і як бы ні падцягнулі сэрвіс, без смачнай і адметнай кухні наўрад ці атрымаецца малюнак «прывабнай» турыстычнай краіны. Нездарма ж гастранамічны турызм ва ўсім свеце прызнаны адным з найбольш перспектыўных і прыбытковых кірункаў... Калі некалькі гадоў таму разам з членамі журы конкурсу на найлепшую аграсядзібу я паездзіла па Беларусі, падумала, што ў нашых вёсках ён можа паспяхова развівацца. Прыемна, што гаспадары аграсядзіб увесь час шукаюць новыя падыходы, але для таго каб зрабіць прывабны турпрадукт, ім не прыйшлося нешта выдумляць. Стаўка зроблена на адраджэнне беларускай культуры і традыцый, у тым ліку кулінарных.

Сёння гаспадары аграсядзіб не толькі запрашаюць у госці, але і з ахвотай дзеляцца народнымі рэцэптамі. Беларускай грамадскай арганізацыяй «Адпачынак у вёсцы» і студэнтамі факультэта міжнародных адносін БДУ была створана кулінарная карта, дзе размешчана інфармацыя па аграсядзібах, у якіх можна пачаставацца сапраўднымі нацыянальнымі стравамі. А днямі пачаў працаваць і адмысловы кулінарны сайт «Гасцінія», на якім, акрамя сакрэтаў беларускіх страў, можна пазнаёміцца з людзьмі, якія ўсё гэта ўмеюць гатаваць, даведацца пра кулінарныя маршруты, фэсты і святы, якія ладзяцца ў Беларусі.

Паверце, сярод адроджаных гаспадарамі аграсядзіб страў багата такіх, якія можна раскручваць як брэндавыя. Вясковыя каўбаскі і вантрабянка могуць стаць для нас такой жа візітоўкай, як хамон для іспанцаў, а клёцкі «з душамі» не горшыя за цэпеліны. Можна нават прапанаваць альтэрнатыву гарэлцы — збіцень, медавуху, хрэнавуху, дуку. А вы чулі пра лекавую настойку ядлоўцу? За ёй, аказваецца, нават любоўная гісторыя стаіць: малады чаляднік аптэкара наведаўся ў панскі сад па кветкі для паненкі, быў злоўлены на гарачым, але атрымаў дараванне за свой учынак, калі падзяліўся карысным рэцэптам.

Інфармацыя на кулінарным сайце будзе пастаянна абнаўляцца. Хоць ужо зараз аматарамі сабрана больш за 200 рэцэптаў. Безумоўна, шмат можна зрабіць, каб аднавіць некаторыя кулінарныя сакрэты. Памятаеце, у «Новай зямлі» Якуба Коласа гаварылася: «Аздоблен квас быў і грыбамі, // Выключна ўсё баравічкамі». Трэба яшчэ высветліць, як той грыбны квас (ці суп?) гатаваўся.

Дык, а што ж такое банкуха? У ваколіцах Поразава Свіслацкага раёна без гэтай стравы не абыходзілася вяселле. Спячы яе было справай гонару для нявесты. Між іншым, такі выраб з цеста мог не чарсцвець на працягу месяца. Страва была даволі не простай, рабілася ў печы на спецыяльным прыстасаванні. На працягу 3—4 гадзін трэба было пастаянна круціць «верацяно» для выпечкі і паліваць яго цестам. Сёння яе гатуюць і прапануюць гасцям на адной з аграсядзіб у Свіслацкім раёне. А на Валожыншчыне можна пакаштаваць адмысловы дударскі пернік, бабку са скваркамі пышчотную вам прапануюць у Магілёўскім раёне, каркуўку з паляндвіцы ў бульбяным жупане — пад Пухавічамі, капусту ў вілках па-старабеларуску — на Кобрыншчыне, варэнне з шышак — у Камянецкім раёне...

І хай ікнецца таму, хто іранічна заве Беларусь «Драніклэндам».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

### Рэцэпт той самай банкухі



**Інгрэдыенты:** *яйкі (50 шт.), масла (1 кг), мука (1 кг), цукар (1 кг), алей «Сялянскі».*

Для прыгатавання банкухі неабходна 5 бярэмяў бярозавых дроў, якія трэба раскалоць на трэсачкі, пры спальванні іх будзе непасрэдна пячыся банкуха.

Печ неабходна разаграваць з дапамогай дроў на працягу дзвюх гадзін.

У міску выкладваць масла паступова і расціраць з цукрам паўтары гадзіны. Узбіць жаўткі. Бялкі ўзбіць асобна. Злучыць і расцерці масла, цукар, муку, жаўткі з бялкамі.

Падрыхтаваць спецыяльны станок для выпечкі і змясціць яго ў печы.

«Верацяно» драўлянае з ліпы абкруціць паперай і замацаваць (абматаць ніткамі), абмашараваць паперай з-пад масла. Паўгадзіны неабходна гэта прыстасаванне разаграваць каля печы.

Удзельнічаць у працэсе выпечкі павінна не менш як тры чалавекі, таму што на працягу 3-4 гадзін адзін абавязкова круціць рукаятку ў печы з «верацяном», другі сочыць за полымем у печы і падкладвае трэсачкі, трэці — палівае на «верацяно» цеста.

Калі цеста закончылася, выраб на «верацяне» неабходна астудзіць на працягу гадзіны, затым абрэзаць справа і злева і выцягнуць ніткі. Толькі у такім выпадку атрымаецца кулінарны выраб «спаўзе» з «верацяна».

Банкуху выкладваюць на ручнік у падушку з пер'я і круцяць да той пары, пакуль не астыне.

# «БАБУЛЯ НА ГАДЗІНУ...»



**Ніна Ягораўна гуляе са Стасікам...**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Я выбрала кірунак «Бабуля на гадзіну». У мяне быў такі парыў, калі даведалася пра гэта! Мы ходзім дапамагаць у сем'і, сядзім з дзеткамі, калі маме трэба ў паліклініку або яшчэ кудысьці.

— Асноўны наш «кадравы рэзерв» — актыўныя пенсіянеркі, якія наведваюць Універсітэт трэцяга ўзросту, — расказвае кіраўнік праекта «Бабуля на гадзіну» Наталля Яцэвіч. — Многія з іх даўно выгадавалі сваіх дзяцей, дапамаглі вырасціць унукаў і цяпер адчуваюць сябе адзінокімі. Ім хочацца падзяліцца з кімсьці сваёй душэўнай цеплынёй, пашырыць круг зносін, адчуць сябе патрэбнымі.

У такіх бабулях маюць патрэбу і маладыя мамы, у якіх нярэдка паблізу няма нікога, хто мог бы дапамагчы. І ні для аднаго дзіцяці ніколі не будуць лішнімі ўвага і любоў, няхай нават і староннега чалавека. Кожнай сям'і патрэбна бабуля, і калі сваёй няма або яна далёка, тут мы і прыходзім на дапамогу. «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» дала нам спіс сем'яў, мы іх абзвоньваем і дамаўляемся, куды і калі трэба дасылаць сваіх валанцёраў.



**... і з маленькай Ксенюшкай.**

Акрамя таго, я раздала ўсім свае тэлефоны, і калі маме трэба куды-небудзь схадзіць, яна тэлефануе. Мы патрэбныя гэтым сем'ям, часам нават проста каб пагаварыць з мамай і даць ёй выгаварыцца — гэта таксама немалаважна. І мы гатовыя прыйсці на дапамогу.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ■ Прырода і мы

# Багацце, якое трэба зберагаць

**Дзяржаўныя ўлады і экологі заклапочаны станам водных аб'ектаў, і, нягледзячы на тое, што водных рэсурсаў у нашай краіне дастаткова для задавальнення сучасных і перспектыўных патрэб, праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на іх рацыянальнае выкарыстанне і ахову.**

**Начальнік аддзела выкарыстання і аховы вады Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Таццяна СЛІЖ** адзначыла, што ў сувязі з пераходам на прымяненне палепшаных даступных тэхнічных метадаў за апошнія 15 гадоў скараціліся аб'ёмы здабычы вод на 23%. У апошні час удзельнае водапажыванне на душу насельніцтва скарацілася з 214 да 137 л/сут/чал., а выкарыстанне вады на вытворчыя патрэбы — на 393 млн $м^3$ (50%). Апошняму спрыяла ўстаноўка лічыльнікаў водапажывання. Сёння такім улікам ахоплена 100% аб'ектаў прамысловасці і 96% сельскагаспадарчых арганізацый.

Скараціліся таксама аб'ёмы выкідаў недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у паверхневыя водныя аб'екты — за апошнія 17 гадоў яны зменшыліся на 19,3 млн $м^3$ (78%). Гэтага ўдалося дасягнуць за кошт уводу ў эксплуатацыю 94 ачышчальных збудаванняў каналізацыі ў розных гарадах (Івацэвічы, Валожын, Мядзел, Глуск, Горкі, Чавусы, Іўе, Ушачы і інш.). Будаўніцтва і рэканструкцыя гэтых аб'ектаў ажыццяўляліся за кошт бюджэтных і крэдытных сродкаў міжнародных арганізацый.

У краіне штогод праводзіцца аналіз больш як 10 тысяч проб вады, кантралюецца больш як 500 спускаў сцёкавых вод.

**Алена БАГАДЗЯЖ, начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела маніторынга паверхневых вод Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя** расказала аб маніторынгу паверхневых і падземных вод, які праводзіцца ў краіне:

— Сёння налічваецца каля 300 пунктаў назірання на 160 водных аб'ектах. Маніторынг падземных вод праводзіцца на 97 гідрагеалагічных пастах па 347 рэжымных наглядальных свідравінах. Усе атрыманыя актуальныя даныя знаходзяцца ў адкрытым доступе на афіцыйным сайце Мінпрыроды.

Для паляпшэння экалагічнага стану паверхневых водных аб'ектаў, а таксама ў мэтах актывізацыі і стымулявання дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў Мінпрыроды праводзіцца конкурс на найлепшае ўладкаванне і падтрыманне ў належным стане месцаў карыстання паверхневымі воднымі аб'ектамі для рэкрэацыі, спорту і турызму.

**Вольга ПРАЛЮК.** *pralyuk@zviazda.by*

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

**о проведении аукциона по продаже** гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов дер. Калюжки, дер. Замлынье, дер. Яловица, дер. Калюга и дер. Белая Лужа Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
|---|---|---|
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **21 апреля 2017 года, в 15.00**<br>г. Жодино, пер. Молодежный, 3<br>Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3 | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот №1 –** земельный участок №9 площадью 0,1103 га с кадастровым номером 624881707601000236 в деревне Калюжки<br>**Лот №2** – земельный участок площадью 0,1498 га с кадастровым номером 624881706601000060 в деревне Замлынье<br>**Лот №3 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881715101000113 в деревне Яловица<br>**Лот №4 –** земельный участок №1 площадью 0,1360 га с кадастровым номером 624881707501000109 в деревне Калюга<br>**Лот №5 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881707601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная цена продажи | **Лот №1** – 8 000,00 рублей<br>**Лот №2** – 5 000,00 рублей<br>**Лот №3 -** 7 000,00 рублей<br>**Лот №4 –** 5 000,00 рублей<br>**Лот №5 –** 4 000,00 рублей |
| 8 | Условия проведения аукциона | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории страны или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | **Лот №1 (ведется проектирование электроснабжения, возможность газоснабжения)**<br>**Лоты № 3 (возможность электроснабжения, газоснабжения)** |
| 10 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной цены земельного участка, р/с 3641061600574 в ЦБУ №616 ОАО «АСБ Беларусбанк»<br>г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 810, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12 | Окончательный срок приема заявлений | **17 апреля 2017 года до 17.00** |
| 13 | Контактные телефоны | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174,<br>8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: земельный участок в дер. Калюжки – 1 681,05 рубля, земельный участок в дер. Замлынье – 1 657,92 рубля, земельный участок в дер. Яловица – 1 725,23 рубля, земельный участок в дер. Калюга – 1 652,57 рубля и земельный участок в дер. Белая Лужа – 1 444,83 рубля (без учета стоимости информационного сообщения).**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

22 сакавіка 2017 г.
№ 9 (393)


НАВІНА Ў НУМАР

## ПРАЦАВАЦЬ ПА-ГАСПАДАРСКУ

**У Брэсцкай вобласці да рэфармавання праблемных сельгаспрадпрыемстваў падыходзяць прадумана. Такое меркаванне выказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ у час рабочай паездкі ў Лунінецкі раён.**

«Што датычыцца ўказа №253 (« Аб мерах па фінансаваму аздараўленню сельскагаспадарчых арганізацый»), я хацеў бы адзначыць, што вобласць вельмі якасна, прадумана, на добрым арганізацыйным узроўні паставілася да пытанняў праблемных гаспадарак. Тут з 215 гаспадарак 54 знаходзяцца або на дасудовым аздараўленні , або ў стане санацыі. Гэта немалая ўдзельная вага. Па кожнай гаспадарцы ёсць дарожная карта. Вядома, не ўсе яшчэ пытанні знаходзяць рашэнне, але людзі турбуюцца, няма нейкіх утрымальніцкіх настрояў, гэта абнадзейвае, што рашэнні будуць прыняты вычарпальныя», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Рэалізацыя мер па фінансаваму аздараўленню сельскагаспадарчых арганізацый стала адной з мэт рабочай паездкі ў рэгіён упаўнаважанага Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці. Таксама абмяркоўвалася правядзенне веснавой пасяўной кампаніі, занятасць насельніцтва. Усе гэтыя рэчы ўзаемазвязаныя, лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Ён выказаў заклапочанасць з нагоды недастатковай забяспечанасці сельгасарганізацый мінеральнымі ўгнаеннямі, сродкамі абароны раслін. «Гэта можа сур'ёзна адбіцца на ўраджаі 2017 года», — папярэдзіў мясцовых кіраўнікоў старшыня Савета Рэспублікі.

Падчас рабочай паездкі Міхаіл Мясніковіч наведаў камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Гарадоцкі», фермерскую гаспадарку «Навіцкіх» і камунальнае сельскагаспадарчае унітарнае прадпрыемства «Міжлескае». Таксама ён правёў нараду з удзелам кіраўнікоў Лунінецкага, Пінскага і Ганцавіцкага раёнаў, антыкрызісных кіраўнікоў праблемных сельскагаспадарчых арганізацый.

**БЕЛТА.**

НЕЗАМЕННЫЯ ЛЮДЗІ

# НЕ ПАКІНУЦЬ У ЧАТЫРОХ СЦЕНАХ,

## або Тысяча і адна справа вясковага сацработніка



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Наталля Каляда за сем кіламетраў ездзіць да падапечнай.

**Закаціла веласіпед у двор, накінула фартух — і пабегла... Першая справа, вядома, сагрэць чалавека. Наталля Каляда ідзе па дровы, выносіць попел, каб можна было распаліць у печы. Потым спяшаецца па ваду да студні. Наступнымі ў чарзе паход у магазін, мыццё падлогі і — хоць крышачку размовы з гаспадыняй хаты. Для сваіх падапечных сацыяльны работнік часта становіцца, бадай, адзіным ратавальнікам ад адзіноты.**

### ДАПАМАГАЕ... ЗВОНКІ ГОЛАС

У Баранавіцкім раёне каля 480 людзей не могуць паўнавартасна паклапаціцца пра сябе. Пра магчымых падапечных у тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва паведамляюць работнікі ФАПаў, сельвыканкамаў. Ды і самі сацыяльныя работнікі ходзяць па дамах, распытваюць, ці не патрэбна дапамога.

стар. 6

УЛАСНАЯ СПРАВА

# ЧАС ПАДНЯЦЦА З КАНАПЫ

## І ПАСПРАБАВАЦЬ СЯБЕ Ў БІЗНЕСЕ

**Інтэрнэт-крама — першы бізнес-праект студэнта Уладзіслава Санько. Ім хлопец стаў займацца разам з сябрам з самага пачатку навучання ва ўніверсітэце. Цяпер Уладзіслаў на трэцім курсе і займаецца аўтсорсінгам. У вольны час ён дае магчымасць сваім аднакурснікам зарабіць у якасці грузчыкаў. Між тым малады чалавек лічыць, што трэба развівацца і вучыцца не толькі ў межах асноўнай праграмы, але і дадаткова. Мэта развіцця сваёй справы і прывяла яго, як і многіх гамяльчан, у стартап-школу, арганізаваную Цэнтрам бізнес-адукацыі Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі ў партнёрстве з таварыствам садзейнічання інавацыйнаму бізнесу.**

— Мне спадабаўся калектыў, — адзначае студэнт-прадпрымальнік. — Тут перспектыўныя маладыя людзі, якія для мяне — прыклад для развіцця. Хачу навучыцца вырашаць праблемы і далей развіваць сваю справу.

У аўдыторыі — 16 мужчын самага рознага ўзросту. І хоць на першых занятках людзей было больш за сотню, на інтэнсіў-курс прыйшлі самыя зацікаўленыя і мэтанакіраваныя. Побач за партай — зусім пачаткоўцы і вядомыя прадпрымальнікі, якія самі могуць стаць ментарамі. Між тым вопыт ёсць у кожнага.

Сяргей Салтановіч пакуль што нідзе не працуе. Ён мае сярэднюю спецыяльную адукацыю і паспрабаваў сябе ў якасці зваршчыка. Гаворыць, што на прадпрыемстве, дзе працаваў раней, яму не падабаўся стыль кіраўніцтва:

— Я не разумеў, навошта раблю гэту справу. Калі няма мэты — нельга працаваць. Я хачу пабудаваць свой бізнес. У тым, што гэта магчыма, мяне тут пераканалі людзі — напрыклад, сузаснавальнік tut.by, hoster.by і іншых кампаній, эксперт Кірыл Валошын. Ён расказаў, як выбраць перспектыўную бізнес-ідэю, што варта капіраваць у паспяховых стартапаў за мяжой, колькі грошай трэба для старту...

стар. 2



Кіраўнік гомельскай стартап-школы Іна Байкова і эксперт інтэнсіў-курса, сузаснавальнік кампаніі «Стартап тэхналогіі» і стартап-рухаў у Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Булах.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Засталося менш за тыдзень

**У апошні дзень сакавіка плануецца адкрыць Гарлыкскі камбінат**

**3 гэтай нагоды на мінулым тыдні адбыўся рабочы візіт старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА ў Туркменістан.**



Яго асноўная мэта — наведванне Гарлыкскага горнаабагачальнага камбіната і вырашэнне пытанняў, якія датычацца завяршэння яго будаўніцтва і здачы ў эксплуатацыю. Спікер верхняй палаты беларускага парламента наведаў шахту па здабычы калійнай руды, фабрыку па вытворчасці калійных угнаенняў, адміністрацыйны комплекс, лабараторыі, склады руды і гатовай прадукцыі. Старшыня Савета Рэспублікі пракантраляваў выкананне работ на аб'екце, будаўніцтва якога з'яўляецца самым маштабным беларуска-туркменскім праектам.

Падчас візіту ў Ашхабад былі разгледжаны пытанні завяршэння будаўніцтва і адкрыцця Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната, прызначанага на 31 сакавіка гэтага года, з удзелам Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава.

## ЖКГ, гандаль, дзяржслужба

**Па такіх кірунках Марыяна Шчоткіна прапанавала працаваць з Казахстанам**

**Беларусі цікавы вопыт Казахстана ў рэфармаванні дзяржслужбы і сферы ЖКГ, паведаміла намеснік старшыні Савета Рэспублікі Марыяна ШЧОТКІНА на сустрэчы са старшынёй Мажыліса (ніжняй палаты) парламента Казахстана Нурланам Нігматуліным.**

Як адзначыла Марыяна Шчоткіна, для Беларусі Казахстан — ключавы партнёр па ўсіх напрамках. Па словах віцэ-спікера верхняй палаты беларускага парламента, надзвычай важна ўмацоўваць міжпарламенцкія сувязі, але ў той жа час нарошчваць гандлёва-эканамічнае і рэгіянальнае ўзаемадзеянне, супрацоўнічаць у галіне навукі і касмічных распрацовак. «Нам вельмі цікавы вопыт Казахстана, мы ведаем, што некалькі гадоў таму вы ўнеслі вялікія змены ў заканадаўства аб дзяржаўнай службе, аб умовах паступлення і парадку праходжання, нам таксама цікавы ваш вопыт у сістэме ЖКГ», — паведаміла намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Сенатар адзначыла, што па выніках 2016 года тавараабарот паміж Беларуссю і Казахстанам знізіўся амаль на 30% і склаў крыху больш за 419 мільёнаў долараў. Марыяна Шчоткіна лічыць, што парламентарыі павінны ўнесці свой уклад у аднаўленне і ўмацаванне гандлёва-эканамічных сувязяў. Віцэ-спікер таксама запэўніла, што беларускі бок зацікаўлены ў як мага больш хуткім запуску шасці новых зборачных вытворчасцяў у Казахстане.

## Адвакаты клапоцяцца аб сваіх правах

**Ніжняя і верхняя палаты абмеркавалі законапраект аб адвакатуры**

**На базе Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь адбылося пашыранае выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Падчас яго былі абмеркаваны прапановы па праекце Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях удасканалення дзейнасці адвакатуры», якія паступілі ад некамерцыйных арганізацый.**

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел як прадстаўнікі дзяржаўных структур, так і недзяржаўныя — рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінскі Камітэт». Фармат відэаканферэнцсувязі з абласнымі цэнтрамі дазволіў таксама прыцягнуць да абмеркавання шырокае кола адвакатаў і іншых зацікаўленых. Удзельнікі пасяджэння разгледзелі больш за 20 прапаноў.

Па выніках работы прыняты рашэнні аб мэтазгоднасці карэкціроўкі палажэнняў, якія датычацца правоў адвакатаў, прыцягнення іх да дысцыплінарнай адказнасці, узаемаадносін адвакатаў з грамадскімі аб'яднаннямі. Акрамя таго, Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь рэкамендавана дадаткова вывучыць пытанне адносна ўдзелу адвакатаў у дзейнасці камерцыйных арганізацый.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ЧАС ПАДНЯЦЦА З КАНАПЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Вядомы бізнесмен Іван Шчарбакоў пачынаў у канцы мінулага стагоддзя. Сёння кіруе ІТ-кампаніямі і сам можа быць экспертам. Дырэктар ТАА «ДатаЦэнтр» кажа, што пастаяннае набыццё ведаў — яго лад жыцця. З сабой на заняткі прынёс новую камп'ютарную праграму, якая прапануе індывідуальны план харчавання і дапамагае набыць аптымальную вагу. Дарэчы, кажа: «Апрабавана на сабе».

Ваенны пенсіянер Канстанцін Скарабагатаў, бадай, самы дарослы ў аўдыторыі. Гаворыць, што ў канцы 90-х спрабаваў займацца дробным гандлем: падпрацоўваў «чаўнаком». Рызыкоўны бізнес прывёў да думкі, што прадпрымальніцтвам трэба займацца правільна:

— Сапраўды хочацца зразумець, як гэта працуе знутры. Атрымаць прававыя веды. Прыемна быць сярод моладзі. Можа, яны мяне нечаму навучаць. У іх жа мазгі «свежыя». Ёсць, канешне, пэўныя асцярогі, але ж самае галоўнае — падняцца з канапы. Важна самому рухацца наперад.

Між тым выпускнік механічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Раман Барушкоў ужо зарэгістраваны індывідуальным прадпрымальнікам. Паслуга, якую ён прапануе гамяльчанам, для абласнога цэнтра не ўласцівая. Ён абяцае навучыць жанчын... абараняцца. Ідэю, дарэчы, Раману падарыла жонка, якой было страшна вечарам хадзіць адной, пакуль муж служыў у арміі:

— Ідэя арганізацыі курсаў самаабароны для жанчын яшчэ ў самым пачатку рэалізацыі. Цяпер набіраем групу, у якой некалькі чалавек. Перад тым як пачаць, мы пратэсціравалі нішу, вызначылі, наколькі будзе запатрабавана такая паслуга.



Заняткі ў гомельскай стартап-школе.

Уся работа, у тым ліку прыёмы і псіхалагічная настройка, накіраваны на тое, што дзяўчына можа быць і на абцасах, і з манікюрам, і не ў самым зручным адзенні. Магчыма, у перспектыве гэта справа перарасце ў нейкі сацыяльны праект. Важна, каб людзі задумаліся пра сваю бяспеку, тым больш часцей за ўсё праблем можна пазбегнуць. Для мяне на курсах важна падзяліцца сваім досведам і ў большай ступені даведацца пра чужы. Таксама важна структураваць свае веды. Справа, якой я пачынаю займацца, толькі стартавы кірунак. Далей планую пайсці ў нейкі вытворчы бізнес.

Гатовыя ідэі для развіцця сваёй справы ёсць далёка не ў кожнага, хто прыйшоў у стартап-школу. Арганізатары лічаць, што ў гэтым ім павінен дапамагчы курс «Інтэнсіў» па праектаванні і запуску бізнесу. У праграме: аналіз рынка, інструментарый аналізу кліентаў, распрацоўка прадукта з улікам інтарэсаў карыстальнікаў, метадалогія тэсціравання бізнес-ідэі, распрацоўка бізнес-мадэлі і яе тэсціраванне, распрацоўка сайта, рэклама праекта, стварэнне каманды і шмат чаго яшчэ.

Кіраўнік гомельскай стартап-школы Іна Байкова адзначае, што адкрытыя майстар-класы наведалі ўсе ахвотныя. Тыя, каго сур'ёзна захапіла ідэя стварэння свайго бізнесу, працягваюць навучанне за невялікія грошы:

— Школа заклікана выконваць ролю ментарскай пляцоўкі для жыхароў Гомельшчыны, каб спрыяць развіццю прадпрымальніцкай культуры, павышэнню дзелавой актыўнасці насельніцтва, развіццю малога і сярэдняга бізнесу, а таксама стварэнню працоўных месцаў. На працягу дзесяці заняткаў удзельнікі інтэнсіўкурса маюць магчымасць атрымаць пэўныя навыкі і развіць кампетэнцыі, каб выкарыстаць іх для запуску сваёй справы. Запрошаныя эксперты з ліку прадпрымальнікаў будуць дзяліцца сваім вопытам, дыскутаваць з навучэнцамі, адказваць на іх пытанні. Па выніках кожных заняткаў прадугледжана дамашняе практычнае заданне. Урэшце, мы спадзяёмся, удзельнікі запусцяць свой уласны бізнес. Адна справа — мець жаданне стаць прадпрымальнікам, іншая — знайсці крыніцу матывацыі. Мы хочам выступаць гэтай крыніцай. Мы зацікаўлены, каб праекты раслі, развіваліся, і з цягам часу нашы ўдзельнікі прыйшлі ў гэтую аўдыторыю ўжо ў ролі экспертаў.

— Мы даём матывацыю і навучанне, — гаворыць эксперт інтэнсіў-курса, сузаснавальнік кампаніі «Стартап тэхналогіі» і стартап-руху ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Булах. — Базавы прынцып стартап-школы: бізнесу можа навучыць толькі прадпрымальнік. Таму экспертамі выступаюць асобы, якія на ўласных поспехах і памылках навучыліся запускаць бізнес і кіраваць ім. Важна, што нашы ўдзельнікі ўрэшце разумеюць, што мець сваю справу — гэта здорава, гэта ганарова. Яны тут пагружаюцца ў прадпрымальніцкае асяроддзе. Мне самому цікава мець стасункі з іншымі прадпрымальнікамі. Зараджаешся энергіяй і новымі ідэямі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «З сітуацыяй разабрацца неадкладна!»

**Падчас прамой тэлефоннай лініі, якую правёў старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ, найбольш часта жыхары цэнтральнага рэгіёна звярталіся па пытаннях нездавальняючай работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Таксама былі нязгодныя з атрыманымі паведамленнямі з падатковай інспекцыі аб уплаце збору на фінансаванне дзяржаўных расходаў.**

У прыватнасці, Галіна Казіміраўна з вёскі Падбярэзь Валожынскага раёна паведаміла: «Мой муж працаваў, але трапіў пад скарачэнне. Ды ён не сядзіць склаўшы рукі. Мы маем гектар зямлі, вядзём падсобную гаспадарку — дзве каровы, свінні, коні, птушка...»

— Вы ў першую чаргу працавалі на сябе, на свой дабрабыт. Больш за тое, вы ў свой час не афармілі ўчастак. А цяпер трэба браць у сельсавеце паперы, што маеце зямлю, і афармляць яе, — растлумачыў Іван Ліпніцкі.

Людміла Васілеўна, інвалід II групы, жыве ў аграгарадку Нарач Мядзельскага раёна. Яе сын атрымаў таксама аналагічнае паведамленне з падатковай інспекцыі. Маці сцвярджае, што ён хворы на сэрца і эпілепсію, таму кінуў работу, якая была звязана з частымі камандзіроўкамі.

— Пры такой хваробе нельга працаваць на вышыні, на механізмах і прыстасаваннях. Усё астатняе — не стварае небяспекі. Магу пасадзейнічаць вам у тым, каб сын прайшоў медыцынскае абследаванне. Патэлефануйце мне ў рабочы час, каб абмеркаваць пытанне. Што датычыцца збору на фінансаванне дзяржаўных расходаў, то можаце звярнуцца ў камісію, якая створана пры райвыканкаме. Яна разгледзіць заяву і прыме адпаведнае рашэнне, — параіў жанчыне Іван Эдуардавіч.

Святлана Леанідаўна з вёскі Брусы Барысаўскага раёна жыве на вуліцы Андрэеўскай, што названа ў гонар яе дзеда, які меў 12 дзяцей. Сапраўды, прыемна жыць на вуліцы, якая носіць імя твайго продка. Але Святлана Леанідаўна сцвярджае, што не надта камфортна адчуваюць сябе тутэйшыя жыхары. Справа ў тым, што ў іх часта прападае вада. Свідравіна, якой ужо 50 гадоў і якая была першапачаткова прызначана для забеспячэння вадой жывёлагадоўчай фермы, часта выходзіць са строю. Было, што вяскоўцам падвозілі пітную ваду цыстэрнай. Як адзначыла заяўніца, патрэбна новая свідравіна, але праблема ў фінансаванні. Іван Эдуардавіч даручыў неадкладна разабрацца з сітуацыяй генеральнаму дырэктару прадпрыемства «Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінскай вобласці» Васілю Шашку і як мага хутчэй наладзіць водазабеспячэнне.



Марыя Георгіеўна з пасёлка Калодзішчы расказала, што 10 студзеня ёй затапілі кватэру — наверсе прарвала ацяпляльную батарэю. Ні гаспадароў, ні іх суседзяў дома не было. І гарачая вада залівала маёмасць амаль што пяць гадзін... Цяпер неабходна сабраць камісію з прадстаўнікоў адпаведных службаў — каб ацаніць памер страт. А тым часам жыць у кватэры практычна немагчыма: вільгаць, на сценах пайшла цвіль. Іван Ліпніцкі зноў патэлефанаваў старшыні Мінскага райсавета, каб той тэрмінова звязаўся з абласной ЖКГ. — Выедзем і ацэнім сітуацыю, пастараемся арганізаваць рабочую камісію, — запэўніў Іван Ліпніцкі.

За тры гадзіны старшыня аблсавета выслухаў больш за 20 чалавек. На многія звароты ён даў тлумачэнні адразу ж. На іншыя, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, людзі атрымаюць адказ на працягу месяца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Ад супрацьстаяння да абмеркавання

## Як мяняўся Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў на працягу 100 гадоў

**17 сакавіка сталічнаму органу мясцовага самакіравання споўнілася сто гадоў. За гэты час Савет не раз змяняў назву, прапіску і нават асноўныя функцыі. Пра яго станаўленне і цяперашні стан нам расказаў старшыня Пастаяннай камісіі мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Георгій АТАМАНАЎ.**



Перадумовай для стварэння Саветаў стала рэвалюцыя 1905—1907 гадоў. «Маніфест аб удасканаленні дзяржаўнага парадку» з'явіўся ўступкай царскай улады народу, аднак паўнамоцтвы рабочых, салдацкіх, матроскіх і сялянскіх дэпутатаў былі строга абмежаваныя. Значна шырэйшымі яны сталі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года.

Што датычыцца Мінска, то статус цэнтра Заходняй вобласці накладваў на яго сур'ёзны адбітак. Пра перамогу Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе і звяржэнне самадзяржаўя цяперашняй сталіцы Беларусі стала вядома 14 сакавіка 1917 года. А ўжо 17 сакавіка на сходзе, скліканым па ініцыятыве служачых мінскіх арганізацый Усерасійскага земскага саюза, быў абраны Часовы выканаўчы камітэт з 9 чалавек, што і паклала пачатак утварэнню Мінскага Савета. Ён размясціўся ў будынку гарадской управы і думы на рагу вуліц Юр'еўскай у доме №2 і Губернатарскай (цяпер вуліца Леніна). Дарэчы, вядомая з XVI стагоддзя Юр'еўская пасля знікла з-за налётаў фашысцкай авіяцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У ліку першых мерапрыемстваў камітэта было раззбраенне паліцыі, а 18 сакавіка пазбавіліся сваіх пасад мінскі губернатар Друцкі-Смалінскі і яго намеснік. Часовы выканкам выпусціў першы нумар сваёй газеты «Известия Совета рабочих депутатов», у якой звярнуўся з заклікам да працоўных Мінска выбіраць сваіх дэпутатаў у Савет.

У першыя месяцы пасля Лютаўскай рэвалюцыі Мінскі Савет не прэтэндаваў на ўладныя паўнамоцтвы і выступаў у якасці грамадска-палітычнай структуры, заклікаючы арганізаваць рабочых і салдат на падтрымку новага дэмакратычнага ладу і супрацьстаяць магчымым вылазкам прыхільнікаў звергнутай манархіі.

На дзейнасць Савета вялікі ўплыў аказвала група дэлегатаў-бальшавікоў, таму быў уведзены 8-гадзінны працоўны дзень на прадпрыемствах і ў майстэрнях Мінска, прынята рэзалюцыя аб нацыяналізацыі асноўных галін прамысловасці, неадкладнай перадачы памешчыцкіх зямель сялянам і інш. Пасля перавыбараў у верасні 1917-га бальшавікі атрымалі ў Савеце большасць. Пад іх кіраўніцтвам Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў стаў адным з органаў падрыхтоўкі ўзброенага паўстання. 7 лістапада ўжо да 14 гадзін выканкам Мінскага Савета надрукаваў і распаўсюдзіў сярод жыхароў горада загад № 1, які паведамляў, што ўлада ў Мінску перайшла ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У той жа дзень для абароны рэвалюцыі з былых палітвязняў (салдат і унтэр-афіцэраў) мінскай турмы і гаўптвахты быў сфарміраваны Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета полк. Ён заняў галоўныя аб'екты горада: пошту, тэлеграф, чыгуначную станцыю, ваенныя склады, што спрыяла ўсталяванню савецкай улады ў Мінску і ва ўсёй Беларусі.

Дарэчы, напярэдадні рэвалюцыі, у кастрычніку 1917 года Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў перамясціўся на вуліцу Петраградскую (цяпер Ленінградская) у дом №6. Тут жа размяшчаліся Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б) і рэдакцыя газеты «Звязда». Цяпер у гэтым будынку знаходзіцца адзін з навучальных карпусоў медуніверсітэта.

Дэпутатамі Мінскага гарадскога Савета былі як простыя працоўныя, так і выдатныя дзеячы навукі, культуры і мастацтва. (Сярод іх у розныя гады — Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Яўген Цікоцкі, Рыгор Шырма, Барыс Сачанка, Віктар Тарасаў і многія іншыя.) У пасляваенны перыяд дэпутатамі гарсавета часта абіраліся франтавікі і заслужаныя перадавікі вытворчасці. Напрыклад, пасля выбараў у 1950 годзе ў ліку дэпутатаў было 11 Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай Працы, 5 лаўрэатаў Сталінскай прэміі, у скліканні 1955 года — 26 чалавек мелі вучоную ступень і 15 — ганаровыя званні.

У 20—40 гады мінулага стагоддзя ў кампетэнцыі Савета знаходзіўся абсяг эканамічных пытанняў: жыллёвыя, харчовыя, будаўнічыя, камунальнай гаспадаркі і шэраг іншых. 16 лютага 1927 г. старшыня С. В. Яцкевіч у сваім дакладзе гаварыў аб выкананні «наказаў па пашырэнні і патанненні жыллёвага будаўніцтва; вырашэнні асноўных задач па добраўпарадкаванні горада (святло, вада, каналізацыя); барацьбе з беспрацоўем; паляпшэнні культурна-сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва; правядзенні нацыянальнай палітыкі; развіцці і ўмацаванні гарадскіх прадпрыемстваў; правядзенні рэжыму эканоміі і зніжэнні рознічных цэн...» Гэтыя тэмы не страцілі сваёй актуальнасці і праз 90 гадоў.

У пасляваенны перыяд на першае месца выйшлі пытанні аднаўлення народнай гаспадаркі сталіцы, выканання пяцігадовых планаў развіцця Мінска па ўсіх галінах: прамысловасці, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, народнай адукацыі і культурнага абслугоўвання насельніцтва горада, аховы здароўя, гандлю і грамадскага харчавання. Заслухоўваліся справаздачы аб рабоце пастаянных камісій гарсавета.

> У першыя месяцы пасля Лютаўскай рэвалюцыі Мінскі Савет не прэтэндаваў на ўладныя паўнамоцтвы і выступаў у якасці грамадска-палітычнай структуры

У 1960—1980 гады на парадку дня сесій гарсавета стаялі ўсе пытанні паўсядзённага жыцця сталіцы: да ўжо вядомых дадаліся развіццё і ўмацаванне сацыялістычнай законнасці і правапарадку, будаўніцтва паліўна-энергетычнага комплексу, выпуск тавараў народнага спажывання, падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў і г. д.

Складаным перыядам для дэпутацкага корпуса сталіцы былі 1990-я і пачатак 2000-х гадоў. Час здабыцця рэспублікай незалежнасці быў нялёгкім як у грамадска-палітычным, так і ў сацыяльна-эканамічным развіцці сталіцы. Ад гарадскога Савета дэпутатаў патрабаваліся сур'ёзная ўзважанасць і дакладна выверaныя рашэнні па ўсіх кірунках паўсядзённага жыцця амаль двухмільённага мегаполіса, выкананне наказаў выбаршчыкаў.

Сёння Мінскі гарадскі Савет складаецца з 57 абраных грамадзянамі дэпутатаў. Сваю работу ён ажыццяўляе праз 9 пастаянных камісій, пасяджэнні прэзідыума і сесіі, шляхам рэалізацыі дэпутатамі сваіх паўнамоцтваў у выбарчых акругах, удзелу ў рабоце камісій, якія ствараюцца гарвыканкамам або адміністрацыямі раёнаў, і ў семінарах па пытаннях гарадской жыццядзейнасці.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

### Віншаванні

У гонар стагоддзя Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў прайшоў урачысты сход, падчас якога **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА** адзначыла, што ў дасягненнях сталіцы вялікая роля дэпутатаў Мінгарсавета.

— Мінск — асаблівы горад, сэрца краіны, і да дэпутатаў тут прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні. Ад іх прафесіяналізму залежыць, у якім кірунку будзе развівацца сталіца. Важна, што дакументы, якія прымаюцца, у прыватнасці, бюджэт, інвестыцыйная праграма, носяць сацыяльную скіраванасць, — адзначыла Марыяна Шчоткіна.

Зразумела, не застаўся ў баку ад значнай падзеі і **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ**. Ён заўважыў, што юбілейны для Мінскага гарадскога Савета год супадае з 950-годдзем сталіцы. Мэр падкрэсліў, што ў тым, чым ганарыцца сталіца, ёсць вялікая заслуга дэпутатаў — і цяперашніх, і тых, якія стаялі ля вытокаў стварэння Савета.

Па словах **старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васіля ПАНАСЮКА**, трывалы падмурак кіравання горадам, створаны папярэднімі пакаленнямі, накладае велізарную адказнасць на сённяшні дэпутацкі корпус, які заклікаы захаваць дасягнутае і прыўнесці новае. Праца Мінгарсавета складаецца не толькі з рашэння агульнагарадскіх задач, але і з рэалізацыі індывідуальных дэпутацкіх праграм, выканання наказаў выбаршчыкаў, удзелу ва ўсіх падзеях гарадскога жыцця.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## У Александрыі пакажуць «купальскі» цырк

Падрыхтоўка да галоўнага купальскага фестывалю «Александрыя збірае сяброў» ідзе поўным ходам, ужо адбылося два пасяджэнні дзяржаўнага аргкамітэта. Прыгожае купальскае свята будзе праходзіць на сваёй традыцыйнай пляцоўцы ў Шклоўскім раёне 8 і 9 ліпеня. Яго праграма абяцае быць надзвычай цікавай. Акцэнт, як адзначыла **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Алена БАБРОВА**, будзе зроблены менавіта на міжнароднасці. Калі летась да пастаянных удзельнікаў форуму Беларусі, Расіі і Украіны далучылася Літва, то сёлета завітаюць прадстаўнікі Эстоніі, Латвіі, Польшчы і Германіі.

Разынкай фестывалю стане вялікае эстрадна-цыркавое шоу «Купалле крочыць па планеце», білеты на якое паступяць у продаж ужо з 1 красавіка. Прадстаўленне завершыцца яшчэ адным грандыёзным шоу — парадам феерверкаў з удзелам гасцей з іншых краін.

Вялікае купальскае свята прапануе прыняць удзел у пазнавальнай квэст-гульні «У пошуках папараць-кветкі», якая дасць магчымасць далучыцца да народных традыцый нашых продкаў. Ёсць добрая нагода папрактыкавацца ў вырабе купальскіх вянкоў і прыняць удзел у спецыяльным конкурсе. На Купалле запрошаны фальклорныя калектывы і майстры дэкаратыўна-прыкладного мастацтва краін-суседак, якія пазнаёмяць са сваімі абрадамі і пачастуюць нацыянальнымі стравамі. У праграме свята шмат відовішчных конкурсаў і прэзентацый, выставак і майстар-класаў. Як заўсёды на свяце будзе шмат смачнай ежы і напояў, для дзяцей — гульняў і забаў, для дарослых — захапляльных шоу, у тым ліку і паветранае з удзелам парашутыстаў.

На Купалле ў Александрыю прыедуць папулярныя беларускія, украінскія і расійскія артысты. Сярод іх — спявачка з Украіны Ірына Білык, а для аматараў бардаўскай песні будзе спяваць вядомы выканаўца з Германіі Ціна Айсбрэнэр. Вядучца перамовы накont удзелу ў фестывалі расійскіх зорак Таццяны Буланавай, Мікіты Праснякова і гурта «Рукі ўверх».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

БУДЗЬ У КУРСЕ!

## Лес зноў чакае сваіх памочнікаў

**Па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі і харчавання сёлета традыцыйная добраахвотная акцыя «Тыдзень лесу» пройдзе з 1 па 8 красавіка.**

Гэта ўжо дзясятае па ліку падобнае мерапрыемства. У гэтым годзе яно будзе прысвечана аднаўленню лесу, пашкоджанаму леташнімі ўраганнымі ветрамі. Да ўдзелу ў акцыі запрашаюцца ўсе ахвотныя.

На сайце Мінлясгаса ў хуткім часе будзе створаны спецыяльны раздзел з указаннем аб'ектаў, дзе можна будзе «прыкласці рукі», нумарамі тэлефонаў і іншай даведачнай інфармацыяй для меркаваных удзельнікаў мерапрыемства. Дарэчы, летась акцыя стала самай масавай з моманту правядзення — у ёй за восем дзён паўдзельнічала амаль 81 тысяча чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

СІТУАЦЫЯ

# СПРЭЧНАЕ СМЕЦЦЕ

## Пенсіянерка з Магілёва лічыць, што з яе не павінны браць грошы за вываз камунальных адходаў

**Жанчына жыве ў прыватным сектары і ўтылізацыяй свайго смецця займаецца самастойна. — Паперу, пластык і метал здаём у нарыхтоўчыя пункты — муж на гэтыя грошы цыгарэты купляе, — кажа яна. — А раслiннасць ідзе на кампост. Нічога лішняга не застаецца. Навошта мне плаціць за вываз адходаў?**



Пенсіянерка ўпэўнена ў тым, што мае рацыю, і намерана далей даказваць, што абавязваць усіх плаціць за гэтую паслугу несправядліва. Нават знайшла сабе групу падтрымкі з ліку суседак па вуліцы.

Для камунальнікаў ваяўнічы настрой некаторых прадстаўнікоў насельніцтва — не нагода для вызвалення іх ад налічэнняў за вываз і ўтылізацыю адходаў. Гэта сёння адна з асноўных камунальных паслуг, і плаціць за яе павінны ўсе.

— Калі людзі пачынаюць пярэчыць наконт вывазу смецця, мы ім нагадваем пра Указ №535 ад 31.12.2015 года «Аб прадастаўленні жыллёва-камунальных паслуг» і пра артыкул 29.5 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, дзе гаворыцца, што адмова ад заключэння дагавора са Спецаўтапрадпрыемствам (САПам) на аказанне гэтай паслугі не вызваляе чалавека ад неабходнасці плаціць, — паведамілі ў Магілёўскім упраўленні камунальных прадпрыемстваў.

У сувязі з пераходам на адзіную інфармацыйную сістэму разлікаў за спажытыя жыллёва-камунальныя і іншыя паслугі летась у Магілёве да агульнай базы далучылі і жыхароў прыватнага сектара. Гэта адразу ж выклікала рост колькасці незадаволеных. Калі раней там плацілі за ваду, каналізацыю, ацяпленне і вываз камунальных адходаў па асобных квітанцыях, то зараз за ўсё плацяць па адзінай. Цяпер паслугу стала нязручна ігнараваць.

> Тое, што плаціць за вываз і абясшкоджванне адходаў мы павінны, гэта відавочна. Інакш хутка можна свой двор ператварыць у смеццевы палігон.

— Часам даходзіць да смешнага, — расказвае **начальнік службы камунальных сістэм і разлікаў Магілёўскага ЦГІС Таццяна КОРШУНАВА**. — Аднойчы да нас звярнулася жанчына і паведаміла, што яна не жадае плаціць за вываз адходаў таму, што выкідвае іх не ў свой кантэйнер каля дома, а носіць у той, што стаіць на школьным двары. Яна не разумее, што за вываз смецця са школьнага двара таксама нехта плаціць. Або спажывец жадае адмовіцца ад паслугі на падставе таго, што нехта, зарэгістраваны на яго жылой плошчы, там не жыве. Мы гатовы пайсці насустрач, але павінны ведаць, куды той чалавек пераехаў, каб налічыць яму суму па іншым адрасе. Калі ён наогул паехаў з горада на працяглы тэрмін, павінны быць дакументы, якія пацвярджаюць гэты факт. Так патрабуе закон. А ён адзіны для ўсіх.

Сёння кожны жыхар прыватнага сектара штомесяц плаціць 1,33 рубля за вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў. І гэта лічба ўзятая не са столі. Існуе нарматыў на чалавека, зацверджаны Магілёўскім гарвыканкамам, які складае 2,17 кубаметра ў год.

— Для кожнага рэгіёна інстытутам «Белжылпраект» быў распрацаваны свой нарматыў, — тлумачыць **галоўны спецыяліст упраўлення ЖКГ аблвыканкама Марына ПАДГЛАЗАВА.** — Навуковыя супрацоўнікі вывучалі, колькі смецця вывозіцца, перыядычнасць яго вывазу, колькі ўсталявана кантэйнераў, іншыя дэталі. Таму лічба гэта абгрунтаваная.

Камунальнікі правялі неяк эксперымент — паглядзелі «марфалагічны склад» смецця, прывезенага з прыватнага сектара Магілёва. У амаль 100 кілаграмах аказалася 1,4 кілаграма шкла, 0,5 — пластмасы, 1,2 — бруднага поліэтылену, 2,2 — макулатуры, 2,8 — тэкстылю, 10 кілаграмаў драўняных адходаў, 25,3 — арганікі, 5,9 — будаўнічых адходаў, 22 кілаграмы — рознага бруду.

Там, дзе прыватны сектар шчыльна мяжуе са шматпавярховай жылой забудовай, камунальнікі ставяць кантэйнеры з разлікам на гэта суседства. І яны заўсёды перапоўненыя. Валянціна Плескачова ўспамінае, як пасля ліквідацыі стыхійнай звалкі ў раёне Карабанаўкі там паставілі два кантэйнеры. І іх не хапала. Часам прыходзілася двойчы на дзень вывозіць смецце. Наогул за мінулы год Спецаўтапрадпрыемствам было вывезена 505 кубаметраў адходаў са звалак — яроў і іншых несанкцыянаваных месцаў.

**ЦІКАВА!**

Тры гады таму ў Магілёве быў выпадак, калі мясцовы жыхар дабіўся таго, што САП скасавала з ім дагавор на вываз і абясшкоджванне цвёрдых камунальных адходаў. Мужчына звяртаўся ў розныя інстанцыі і нават пракуратуру наконт незаконнасці ўтрымання з яго грошай за гэту паслугу. У якасці рэчавых доказаў прад'явіў чэкі, якія сведчылі, што ён сапраўды вывез на агульнагарадскі палігон неабходны аб'ём смецця. Але сёння адсутнасць дагавора не вызваляе спажыўца ад неабходнасці плаціць за паслугу.

— Кожны крычыць пра тое, што ў яго смецця няма. Але адкуль тады бяруцца гэтыя несанкцыянаваныя звалкі вакол горада? — абураецца **намеснік дырэктара Магілёўскага Спецаўтапрадпрыемства Валянціна ПЛЕСКАЧОВА.** — І нехта ж амаль 20 гектараў агульнагарадскога палігона насыпаў. Чаму мы павінны бясплатна прыбіраць звалкі, якімі нядбайныя «прыватнікі» завалілі ўсю рэчку Дзебру? Летась мы месяц чысцілі берагі ракі ад смецця. Цягалі мяшкамі па крутым схіле. Гэта называецца «ў людзей смецця няма». Хай з намі пройдуцца па стыхійных звалках і паглядзяць.

Тое, што плаціць за вываз і абясшкоджванне адходаў мы павінны, гэта відавочна. Інакш хутка можна свой двор ператварыць у смеццевы палігон. Вазіць смецце самастойна на агульнагарадскі таксама не атрымаецца. Трэба мець спецыяльную машыну. Але нават камунальнікі прызнаюць той факт, што плата за вываз смецця не павінна быць, як тая тэмпература — сярэдняй па краіне. Усе людзі розныя, і падыходы да ўтылізацыі адходаў таксама ва ўсіх неаднолькавыя. Калі ў краіне практыкуецца дыферэнцыраваны збор бытавога смецця і шмат гаворыцца пра карысць другасных адходаў, павінна быць і сістэма заахвочванняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

# ЗАЙМЕЦЬ ЗЯМЛЮ, ПРЫДБАЦЬ СВОЙ КУТ...

**У свой час многія з вяскоўцаў пераехалі ў гарады. Яны вучыліся тут, працавалі, гадавалі дзяцей і ўнукаў. Цяпер жа, апынуўшыся на заслужаным адпачынку, як мне здаецца, з задавальненнем пакінулі б свае кватэры і пераехалі ў вёскі: у некага там засталіся бацькоўскія хаты. А што рабіць тым, у каго няма? Як пенсіянеру атрымаць зямельны ўчастак (ва ўласнасць або ў арэнду) для будаўніцтва жылога дома ў сельскай мясцовасці?**

**Г.Ф. Пяткевіч,** г. Мінск.

— Паводле Палажэння, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.12.2011 года №1781, улік грамадзян, якія жадаюць атрымаць зямельныя ўчасткі, ажыццяўляецца:

сельскімі, пасялковымі выканкамамі — у дачыненні да зямельных участкаў у межах сельскіх населеных пунктаў, пасёлкаў гарадскога тыпу;

раённымі выканкамамі — у дачыненні да зямельных участкаў у межах гарадоў, якія з'яўляюцца адміністрацыйнымі цэнтрамі раёнаў;

гарадскімі (гарадоў абласнога, раённага падпарадкавання) выканкамамі — у дачыненні да зямельных участкаў адпаведна ў межах гарадоў абласнога, раённага падпарадкавання.

Пастаноўка грамадзян на ўлік ажыццяўляецца ў ходзе прыёму грамадзяніна або яго прадстаўніка на падставе заявы (з прыкладаннем неабходных дакументаў) аб пастаноўцы на ўлік, якая падаецца ў адпаведны мясцовы выканаўчы камітэт. Заявы аб пастаноўцы на ўлік рэгіструюцца ў журнале ўліку, які павінен быць пранумараваны, прашыты і змацаваны пячаткай мясцовага выканаўчага камітэта.

Заява аб пастаноўцы на ўлік разглядаецца на пасяджэнні мясцовага выканаўчага камітэта на працягу 15 каляндарных дзён з дня яе падачы, а ў выпадку запыту мясцовым выканаўчым камітэтам дакументаў і звестак, — на працягу аднаго месяца. Аб выніках разгляду заявы аб пастаноўцы на ўлік грамадзяніну паведамляецца ў пісьмовай форме на працягу 5 каляндарных дзён з дня прыняцця рашэння.

Пастаноўка грамадзян на ўлік ажыццяўляецца з дапамогай фарміравання мясцовымі выканкамамі спісаў грамадзян, якія жадаюць атрымаць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў.

Спісы і інфармацыя аб умовах уключэння ў іх грамадзян размяшчаюцца мясцовымі выканаўчымі камітэтамі ў даступных для азнаямлення месцах на інфармацыйных стэндах, афіцыйных сайтах мясцовых выканаўчых камітэтаў у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, а таксама могуць даводзіцца да насельніцтва іншымі даступнымі спосабамі, у тым ліку праз сродкі масавай інфармацыі.

Пасля ўключэння ў вызначаным парадку зямельных участкаў у пералік свабодных (незанятых) зямельных участкаў, якія могуць быць выдзелены грамадзянам для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў, такія ўчасткі прапануюцца грамадзянам, якія жадаюць іх атрымаць, зыходзячы з даты і часу ўключэння ў спіс, пачынаючы з грамадзяніна, які раней за іншых па даце і часе ўключаны ў спіс.

Шматдзетным сем'ям, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і ўключаны ў вызначаным парадку ў спісы, зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў выдзяляюцца па-за чаргой з улікам паслядоўнасці ўключэння такіх сем'яў у спісы. Права на атрыманне зямельных участкаў грамадзянамі як маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў можа быць рэалізавана толькі адзін раз.

Асаблівасці парадку і ўмоў выдзялення зямельных участкаў (па выніках правядзення аўкцыёнаў або без іх правядзення), а таксама ўнясення платы за зямельныя ўчасткі, што даюцца ў прыватную ўласнасць, і платы за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў у канкрэтных населеных пунктах можна даведацца ў адпаведных мясцовых выканкамах.

**Віктар САВІЦКІ.**

А НЕ ШКОДЗЬ!

## Канцы ў ваду схаваць не ўдалося

Супрацоўнікі Мікашэвіцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету спынілі аўтамабіль у Лунінецкім раёне. Пасажыр з машыны адразу ўцёк, застаўся вадзіцель. У салоне аўто знаходзілася галава казулі і два мяшкі з мясам. На месца прыбылі супрацоўнікі міліцыі. У ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў былі знойдзены шкуры і вантробы ад дзвюх казуль, якія браканьеры пасля разбірання кінулі ў ваду рэчкі Валхва. Пазней устанавілі і асобу пасажыра, што ўцёк. Заведзена крымінальная справа ў дачыненні да двух грамадзян.

Як паведаміў **супрацоўнік Брэсцкай абласной інспекцыі Ігар КАЛЕНЬКА**, памер урону навакольнаму асяроддзю за знішчэнне дзвюх казуль еўрапейскіх ацэнены ў 5520 рублёў, а кошт незаконна здабытай прадукцыі ў 966 рублёў. Акрамя таго парушальнікам пагражае штраф.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# ПРАГМАТЫЧНЫЯ ЛЕТУЦЕННІКІ

## Чацвёрты год жыхары Віцебскага раёна выкарыстоўваюць розныя крыніцы фінансавання для ажыццяўлення сваіх ідэй

**Так, у вёсцы Падбярэззе ў 2013—2014 гадах рэалізоўваўся праект «Падбярэзскі куфар» — вынік супрацоўніцтва Віцебскага раённага выканаўчага камітэта, рэгіянальнай Асацыяцыі наймальнікаў і прадпрымальнікаў і Еўрапейскага саюза. Тады ў раёне былі адкрыты цэнтры дадатковай адукацыі для дарослых, якія наведваюць жыхары і вёсак, і самога Віцебска. Цяпер у Віцебскім раёне ажыццяўляецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Пашырэнне эканамічных магчымасцяў у сельскай Беларусі»: мясцовыя бясплатна засвойваюць камп'ютарную грамату, нюансы вырошчвання раслін, адкрываюць бізнес, развіваюць вясковы турызм і рэалізуюць іншыя цікавыя ідэі, напрыклад, уладкоўваюць стаянку для кемпераў — такой у раёне пакуль няма.**



У цяпліцы будзе працаваць гуртok.

### Спачатку — адукацыя

— Мы тут чэрпаем ідэі і веды для добраўпарадкавання населеных пунктаў, — расказала **старшыня Бабініцкага сельскага Савета Валянціна ВАРОНА**, якая прыйшла на сустрэчу кветкаводаў і дачнікаў, што праходзіла ў рамках названага праекта ў цяпліцы мясцовай фірмы «Дэкафлора».

У планах старшыні сельскага Савета — уладкаванне крыніцы ў вёсцы Падбярэззе. Спецыялісты зрабілі выснову, што вада там вельмі карысная — змяшчае 4 мінералы. Падбярэззе вядома яшчэ і тым, што тут захаваліся 200-гадовыя ліпы і кляновая алея побач са збудаваннямі Таварыства сельскіх гаспадароў, якое існавала ў 1893—1903 гадах.

Запланавана добраўпарадкаванне крыніц і на тэрыторыі іншых сельсаветаў: у аграгарадку Мазалава і вёсцы Лужасна. Добраўпарадкуюць і паркі...

У цэнтры дадатковай адукацыі вёскі Лужасна ў рамках праекта арганізаваны курс «Ландшафтны дызайн з нуля: ад тэорыі да практыкі». Такія цэнтры на сельскіх тэрыторыях —з'ява новая. Іх дзейнасць стала магчымай у рамках ініцыятывы «Адукацыя і адраджэнне гісторыка-эканамічнай спадчыны для ўстойлівага развіцця Мазалаўскага і Бабініцкага сельсаветаў». У Мазалаве і Бабінічах працягваецца курс «Камп'ютар для жыцця і бізнесу». У Бабінічах скончаны курс «Я — прадпрымальнік-пачатковец», па выніках якога малады вясковец арганізаваў нарыхтоўку дроў, а некалькі жанчын падчас водпуску па доглядзе за дзіцем рэалізуюць сябе ў якасці рамеснікаў.

Дапамога вёсцы аказваецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза і Фонду «Еўразія» (за кошт сродкаў Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці USAID). Гэта стала магчымым дзякуючы заяўцы Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, якая перамагла ў конкурсе сумесных ініцыятыў, арганізаваным інфармацыйна-асветніцкай установай «Новая Еўразія». Рэалізацыя праекта скончыцца 1 чэрвеня.

